**ЛАЗАРУК** Міхаіл Арсенавіч [5. 07. 1926, в. Ушалавічы Слуцкага р-на Мінскай вобласці – 14. 11. 2000], беларускі літаратуразнавец, педагог, метадыст. Акадэмік АПН СССР (1982). Доктар філалагічных навук (1970). Прафесар (1971). Выдатнік асветы СССР і БССР.

Скончыў філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1951). З 1954 г. выкладчык, дэкан філалагічнага факультэта, прарэктар па вучэбнай рабоце МПІ, з 1978 г. дырэктар Навукова-даследчага інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР. З 1990 г. узначальваў лабараторыю праблем літаратурнай адукацыі ў Беларускім навукова-даследчым інстытуце адукацыі.

Навуковыя працы М. А. Лазарука прысвечаны тэорыі і гісторыі беларускай літаратуры, методыцы выкладання літаратуры, эстэтычнаму выхаванню вучняў.

Шырока вядомы манаграфіі М. А. Лазарука “Станаўленне беларускай паэмы” (1968), “Беларуская паэма ў другой палавіне XIX– пачатку XX ст.” (1970).

М. А. Лазарук – адзін з аўтараў і разам з А. А. Семяновічам навуковы рэдактар “Гісторыі беларускай літаратуры” ў 4-х т. (1981–1985, 2-е выданне, 1996–2000), аўтар вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў для філалагічных факультэтаў ВНУ і сярэдніх навучальных устаноў: “Уводзіны ў літаратуразнаўства” (з А. Я. Ленсу, 1970, 2-е выданне, 1982), “Беларуская літаратура: Падручнік для IX класа” (з В. У. Івашыным, 1979, 8-е выданне, 1990), “Беларуская літаратура: Падручнік-хрэстаматыя для VI класа” (2000), “Беларуская літаратура: Падручнік-хрэстаматыя для VII класа” (з В. І. Русілкай, І. М. Слесаравай, 2002), “Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў” (з А. Я. Ленсу, 1983), кніг для настаўнікаў “Изучение русской литературы во взаимосвязи с белорусской” (з В. У. Івашыным і А. Я. Ленсу, 1988), зборніка артыкулаў “Навучанне і выхаванне творчасцю” (1994).

У дапамогу настаўніку пры ўдзеле М. А. Лазарука, як адказнага рэдактара, старшыні рэдакцыйнай калегіі выйшла звыш 20 кніг па методыцы выкладання літаратуры, у тым ліку “Патриотическое воспитание на уроках литературы и во внеклассной работе” (М., 1985).

Пад кіраўніцтвам М. А. Лазарука распрацавана канцэпцыя літаратурнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь (1991), створаны новыя школьныя праграмы па беларускай літаратуры.

У знагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, 9-цю медалямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ